Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
УА “Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
_______________ Ю.П.Бондар
“____” _______________ 2017 г.
Рэгістрацыйны № ВД-__/баз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ГІСТОРЫЯ ГІСТАРЫЧНАЙ ДУМКІ

*Вучэбная праграма установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*

*для спецыяльнасці 1-23 01 12*

*Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны(па напрамках)*

Мінск 2017

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі  АСВА 1-23 01 12-2013, вучэбнага плану установы вышэйшай адукацыі па накірунку спецыяльнасці 1-23 01 12-04 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны.
Рэгістрацыйны нумар Е 23-1-26/13 вуч. ад 14 кастрычніка 2013 г.

**Складальнік:**

***Л.У. Ландзіна,***кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

**Рэцэнзенты:**

***У.С. Кошалеў,***доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі новага і найноўшага часу Беларускага дзяржаўнага універсітэта

***М.А. Мажэйка,*** доктар філасофскіх навук, прафесар, загадчык кафедры філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў

**Рэкамендавана да зацверджання:**
Кафедрай гісторыі Беларусі і музеязнаўства установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"
(пратакол №  ад  г.).
Прэзідыумам вучэбна-метадычнага Савета установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"
(пратакол №  ад  2017 г.)

**Адказны за рэдакцыю: ______________________________**
**Адказны за выпуск: ______________________________**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма па вучэбнай дысцыпліне “Гісторыя гістарычнай думкі” уваходзіць у цыкл агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін, прызначаных для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі.

Дысцыпліна “Гісторыя гістарычнай думкі” забяспечвае набыццё агульнаадукаыйных і спецыяльных ведаў і навыкаў, неабходных для прафесійнай дзейнасці будучых спецыялістаў у галіне музеязнаўства і аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Пры выкладанні дасцыпліны “Гісторыя гістарычнай думкі” ажыццяўляецца яго сувязь з такімі дысцыплінамі, як “Усеагульная гісторыя”, “Гісторыя Беларусі”, “Філасофія”, “Культуралогія”, “Гісторыя матэрыяльнай культуры”.

*Асноўныя мэты вывучэння дысцыпліны:* фарміраванне ў студэнтаў сучаснага светапогляду, які забяспечвае свядомую арыентацыю ў грамадскім жыцці, матэрыяльнай і духоўнай культуры, грамадскай думцы і гістарычнай спадчыне, кваліфікаваную ацэнку мінулага і сучаснага, ўменне весці навуковы дыялог і навуковую палеміку.

*Задачы вывучэння дысцыпліны:*

-даць студэнтам сістэмныя веды, якія ўключаюць развіцце гістарычнай навукі на працягу яе існавання ў кантэксце цівілізацыйнага развіцця;

- стварыць комплексную, сістэмную карціну развіцця гістарычнай навукі навукі ў кантэксце сістэмнага бачання развіцця грамадства ў гістарычным, філасофскім і культуралагічным аспектах;

- раскрыць працэсы ўзнікнення і ўзаемнага ўплыву навуковых парадыгм у гістарычнай навуцы;

- паказаць прычыны шматмернасці гістарычных ведаў, розных варыянтаў рэканструкцыі мінулага, а таксама заканамернасці гэтых з’яў і немагчымасць стварэння адзінай кананічнай версіі гістарычнага працэса.

*Метадалагічнай асновай* выкладання з’яўляецца спалучэнне сістэмнага і цывілізацыйнага (культуралагічнага) падыходаў. Курс выкладаецца таксама

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў адпаведнасці з сістэмным падыходам, у сувязі з чым гістарычная навука разглядаецца як асаблівая форма грамадскай свядомасці і культурнай адаптацыі чалавека, што залежыць, у сваю чаргу, ад існуючай у дадзены момант у грамадстве філасофскай карціны свету. Цывілізацыйны (культуралагічны) прадугледжвае разгляд гісторыі гістарычнай навукі, па-першае, у кантэксце цывілізацыйнага развіцця, па-другое кваліфікаваць гістарыяграфію як феномен культуры з усімі вынікаючымі рысамі. У адпаведнасці з прынцыпам гістарызма і гісторыка-генетычным метадам матэрыял выкладаецца ў храналагічнай паслядоўнасці.

Адзначаная мэта прадугледжвае вырашэнне наступных *задач:*

- разуменне працэсу развіцця гістарычнай навукі як складанага сацыякультурнага феномена, дэтэрмінаванага станам грамадства ва ўсіх яго аспектах;
- выхаванне цікавасці і павагі да гісторыі як філасофскага феномена і да гісторыка-культурнай спадчыны, як носьбіта сацыяльнай памяці і нацыянальнай ідэнтычнасці;
- фарміраванне павагі да ўнеску розных народаў Усходу і Захаду ў развіццё гістарычнай навукі;
- суаднясенне дасягненняў сусветнай і айчыннай гістарычнай навукі;
- забеспячэнне пераемнасці і ўзаемасувязі матэрыяла выкладаемага курса як з ведамі, атрыманымі ў агульнаадукацыйнай школе, так і са зместам сумежных дысцыплін (філасофія, культуралогія, гісторыя матэрыяльнай культуры і г.д.) праз міжпрадметныя сувязі.

У выніку вывучэння курса студэнт *павінен ведаць:*

- асноўныя тэндэнцыі, працэсы і падзеі ў развіцці гістарычнай навукі;
- уплыў філасофскай карціны свету, сацыяльных і культурных інстытутаў на мэты і вынікі гістарычных даследаванняў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- сучасныя працэсы і тэндэнцыі развіцця гістарычнай навукі як айчыннай, так і сусветнай.

Студэнт павінен *умець:*

- выкарыстоўваць асноўныя і дадатковыя крыніцы па выкладаемым курсе;
- аналізаваць вывучаемыя працэсы і падзеі, параўноўваць і інтэрпрэтаваць розныя пункты гледжання, выпрацоўваць і аргументаваць уласныя меркаванні;
- прымяняць веды па сумежных дысцыплінах (філасофіі, культуралогіі, айчынай і сусветнай гісторыі, гісторыі матэрыяльнай культуры і г.д.)

Студэнт павінен *валодаць*:

- аперыраваннем атрыманымі ведамі ў незнаемай сітуацыі;
- культурай аргументацыі і дыскусіі;
- сістэмным бачаннем працэсаў, якія адбываюцца зараз у навукова-тэхнічнай сферы;
- уменнямі самастойнай працы і самаадукацыі, сістэматызацыі атрыманых ведаў.

У адпаведнасці з вучэбным планам, курс уключае 30 гадзін, з іх 20 лекцыі, 10 – семінары. Форма правядзення заняткаў – лекцыі і семінары, форма кантролю – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Уводзіны

*Тэма 1. Прадмет, задачы і асноўныя паняцці курса*

Прадмет і задачы курса. Тэорыя гісторыі як вышэйшы ўзровень гістарычнага пазнання. Праблемнае поле тэорыі гісторыі. Філасофія гісторыі. Гісторыя ў анталагічным і гнасеалагічным аспектах. Сутнасць паняцця “гістарыяграфія” і разнабаковасць яго вызначэнняў.Узнікненне гістарыяграфіі і яе суадносіны з гістарычнай навукай. Задачы гістарыяграфіі. Прынцыпы гістарыяграфічнага пазнання. Метады гістарыяграфічнага пазнання. Гістарыяграфічны факт і гістарыяграфічная крыніца.

### Раздзел I. Тэарэтычныя асновы і метадалогія гістарычнай навукі

*Тэма 2. Гісторыя і гістарычны факт*

Вызначэнне гісторыі  і яго шматаспектнасць. Крытэрыі разгалінаванняў гістарычнай навукі. Гісторыя чалавечага грамадства як сістэма. Спецыфічныя рысы грамадства і гісторыі як сістэмнага ўтварэння.

Гісторыя як навука. Спецыфіка гістарычнай навукі. Штодзеннае і навуковае гістарычнае пазнанне. Аб’ект, прадмет і суб’ект гістарычнага пазнання. Актуальнасць і кан’юнктурнасць гістарычнах даследаванняў.

Навуковы факт і яго характэрыстыкі. Філасофскія аспекты навуковага факта. Інтэрпрэтацыя навуковага факта. Спецыфіка гістарычнага факта. Сацыяльная прырода гістарычнага факта, суадносіны факта і крыніцы, двайная суб’ектывізацыя гістарычнай рэканструкцыі.

*Тэма 3.Сацыяльныя функцыі гістарычнай навукі*

Праблема карыснасці гістарычных ведаў. Функцыя сацыяльнай памяці. Гістарычны вопыт і ўрокі гісторыі. Паняцце гістарычнага вопыта і яго засваення грамадствам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Катэгорыя будучага ў гістарычным пазнанні. Навуковы прагноз і яго абгрунтаванне. Узроўні навуковага прагноза. Сацыяльнае значэнне навуковага прагназавання.

Гістарычная свядомасць грамадства і сувязь часоў. Гістарычная памяць грамадства і яе значэнне. Выхаванне гісторыяй, яго задачы і праблемы.

*Тэма 4. Прынцыпы і метады гістарычнага даследавання*

Эмпірычныя і тэарэтычныя веды ў гістарычным пазнанні. Этапы навуковага даследавання. Гіпотэза, збор фактаў, пабудова мадэлі, інтэрпрэтацыя.Прынцыпы гістарычнага пазнання (гістарызм, сістэмнасць, аб'ектыўнасць, каштоўнасны падыход), іх фарміраванне і трансфармацыя ў гістарыяграфіі.

Методыка, метад, метадалогія. Філасофскія, агульнанавуковыя і спецыяльныя гістарычныя метады. Агульнанавуковыя метады эмпірычнага і тэарэтычнага даследавання. Ідэаграфічны і біяграфічны метады. Метады гісторыка-параўнальны, гісторыка-генетычны, рэтраспектыўны, гісторыка-тыпалагічны, гісторыка-сістэмны, дыяхранічны, класавага і тэрміналагічнага аналіза і г.д.

Колькасныя, сацыяльна-псіхалагічныя, герменеўтычныя метады. Інфармацыйна-энтрапійны метад. Семіятычныя, лінгвістычныя, сацыялагічныя, паліталагічныя, мастацтвазнаўчыя, эканамічныя і інш. метады.

*Тэма 5. Фарміраванне метадалогіі гістарычнай навукі і яе развіццё Ў XIX-XXI ст.*

Вызначэнне паняцця "метадалогія". Метадалогія і метад. Функцыі і задачы метадалогіі.Метадологія і парадыгма. Сутнасць тэарэтыка-метадалагічнай парадыгмы. Натуралістычная праграма (рэдукцуыянізм, этнацэнтрызм, арганіцызм). Культурна-цэнтрысцкая праграма. Марксісцкая парадыгма і яе трансфармацыі. Гістарычная сінергетыка. Антрапалагічны і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лінгвістычны павароты ў гістарычным пазнанні.Сітуацыя постмадэрна ў гістарычным пазнанні. “Канец гісторыі”. Макра - і мікрагісторыя. Гісторыя паўсёдзеннасці. Гендэрная гісторыя. Дэмаграфічная, экалагічная, інтэлектуальная гісторыя і г.д.

*Тэма 6. Гісторыя як цэлае. Праблема дынамікі гістарычнага развіцця. Гістарычны дэтэрмінізм*

Праблема цэласнасці гісторыі. Перыядызацыя. Стадыяльнасць. Фармацыйны падыход. Гісторыя як сума культур і цывілізацый. Ідэя культурна-гістарычных тыпаў М. Данілеўскага. Тэорыя О. Шпенглера аб культурах як мностве замкнутых арганізмаў. Канцэпцыі А. Тойнбі і П. Сарокіна. Постмадэрнісцкія трактоўкі цэласнасці гістарычнага працэса.

Накіраванасць гістарычнага працэса як аб’ект разгляду альтэрнатызных канцэпцый. Цыклічнасць, прагрэс, рэгрэс. Трактоўкі прагрэса і яго супярэчлівасць. Крытэрыі прагрэса. Прагрэс і маральнасць.

Гістарычная неабходнасць і магчымасць. Абстрактная і рэальная магчымасць. Тэалагічны і свецкі варыянты разумення гістарычнай неабходнасці. Неабходнасць і заканамернасць, прычыны і наступствы. Праблема існавання законаў гісторыі.

Гістарычны дэтэрмінізм і праблема рухаючых сіл у гісторыі. Канцэпцыі ідэальных рухаючых сіл. Матэрыяльныя фактары ў гісторыі. Геаграфічны, дэмаграфічны, псіхалагічны дэтэрмінізм. Роля асобы ў гісторыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Раздзел II. Гісторыя станаўлення і развіцця гістарычнай навукі (ад старажытнасці да канца XX ст.)**

*Тэма 7. Узнікненне гістарычных ведаў. Антычная гістарыяграфія.*

Захоўванне і перадача гістарычных ведаў у дапісьменнай традыцыі. Найстаражытныя помнікі гістарыяграфіі ў Міжрэччы і Егіпце. Біблія як гістарычная крыніца.

Агульная характарыстыка антычнай гістарыяграфіі. Грамадскае значэнне гістарычных ведаў. Гістарычная заканамернасць і дынаміка гістарычнага працэса.

Зараджэнне гістарычнай думкі ў Старажытнай Грэцыі. Лагографы. “Гісторыя” Герадота і яе значэнне. Фукідыд і “Гісторыя Пелапанескай вайны”. Ксенафонт. Арыстоцель і яго “Афінская палітыя”. Еўгемер і яго ідэя рацыяналізацыі міфаў. Цімей. Эфор. Палібій. Дыядор Сіцылійскі. Плутарх і яго “Параўнальныя жыццяпісы”.

Гістарычныя веды ў Старажытным Рыме. “Пачаткі” Марка Порцыя Катона. “Гальская вайна” Ю. Цэзара. Салюсцій Крысп. Гістарычныя біяграфіі К. Непата, К. Руфа, Г. Светонія Транквіла. Ціт Лівій і “Гісторыя Рыма”. К. Тацыт. “Усеагульная гісторыя “ Пампея Трога. Апіан. Лукіан Самасацкі. Аміян Марцэлін. Іосіф Флавій.

Заснаванне патрыстычнай гістарыяграфіі. Еўсевій, Сульпіцый і Арозій. Аўгусцін Блажэнны і погляды. Патрыстычная гістарыяграфія і сярэднявечная гістарычная думка.

*Тэма 8. Развіццё гістарычных уяўленняў у сярэднявеччы*

Месца і задачы гістарычнай навукі ў сярэднявеччы. Форма захавання і передачы гістарычных ведаў. Метадалогія сярэднявечных храністаў. Перыядызацыя. Фальсіфікацыі і іх мэты.

Еўрапейская гістарыяграфія ранняга сярэднявечча.Уплыў патрыстычнай традыцыі. “Гоцкая гісторыя” Касіядора і “Геціка” Іярдана. Рыгор Турскі, Ісідор Севільскі, Беда Паважны, Павед Дыякан і іх творы. “Каралінгскае адраджэнне”. Эйнгард. Гістарычная навука Візантыі і асаблівасці яе развіцця. Пракопій Кесарыйскі, Канстанцін Парфірародны, Леў Дыякан, Міхаіл Псёл і інш.

Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя змены ў высокім сярэднявеччы і іх уплыў на гістарычную думку. Французская гістарыяграфія высокага сярэднявечча: Гвіберт Нажанскі, Гуга з Флеры, Сугерый, Вілардуэн і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Росквіт французскай хронікі. Англійская гістарыяграфія (Эадмер, Уільям Мэмсберыйскі, Геральд Камбрэйскі, Іаан Сальсберыйскі і г.д.). Гістарыяграфія германскіх зямель: (Ламперт Гердсфельдскі, Фрутольф Міхельсбергскі, Экехард з Аура, Адам Брэменскі, Гельмгольд, Арнольд Любекскі і г.д.). Хронікі італьянскіх гарадоў.

Новыя рысы еўрапейскай гістарычнай думкі позняга сярэднявечча. Папулярызацыя гісторыі. Мемуары (Ж. дэ Жуанвіль, Ф. дэ Камін). Новыя якасці хронік. Хронікі Ж. Лебеля, Ж. Фруасара, Ж. Шателена.

*Тэма 9. Узнікненне і развіццё гістарычных ведаў на землях Русі*

Летапісанне на славянскіх землях: месца стварэння, змест, значэнне. “Аповесць мінулых часоў”. Праблема аўтарства. Іпац’еўскі, Лаўрэнц’еўскі і Наўгародскі першыя летапісы.

Заняпад летапісання падчас мангола-татарскага заваявання. Летапісанне ў Цверы і Маскве. Актывізацыя летапісання ў сярэдзіне XV ст. Ніканаўскі летапіс. Маскоўскае летапісанне. Ідэя ўмацавання ўлады маскоўскіх князёў. Фарміраванне ідэі “Масква – Трэці Рым”.

Фарміраванне расійскага абсалютызма. Палітычная барацьба у перапісцы Івана Грознага і А. Курбскага, І. Перасветава і Ермалая.

Спробы ўключэння расійскай гісторыі ў сусветную. Хранограф першай рэдакцыі. Развіццё архіўнай справы. “Ступенная кніга”. “Асабовы звод Івана Грознага”. “Сінапсіс”. “Скіфская гісторыя” А. Лызлова. “”Гісторыя” Ф. Грыбаедава, “Генеалогія” І. Рымскага-Корсакава, “Сузіранне кароткае” і “Паведамленне сапраўднае” С. Мядзведзева і г.д. Пачатак крытыкі крыніц.

*Тэма 10. Гістарычныя веды ў Еўропе ў ранні Новы час (XVI-XVII ст.)*

Агульныя рысы гуманістычнай гістарыяграфіі. Тэматыка і масштабы гістарычных прац. Узрастанне інтарэса да тэорыі гісторыі. Секулярызацыя гістарычнай думкі. Гістарычная крытыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Італьянскія гісторыкі-гуманісты (Ф. Біёнда, Л. Бруні, П. Брачаліні, П. Лэта, Т. Калька, Б. Джусцініяні, С. Пікаламіні і інш.). Л. Вала і яго ўнесак крытычны метад ў гісторыі. Гістарычныя і палітычныя погляды М. Макіявелі. Гістарыяграфія Германіі і ўплыў на яе ідэй Рэфармацыі. Р. Агрыкала, І. Науклер як прапагандысты гуманістычных ідэй. Гісторыкі-гуманісты пры двары Максіміляна І. С. Франк як прадстаўнік дэмакратычнай плыні ў германскай гістарыяграфіі.

Французская гістарычная думка (Л. Д'Этапль, Г. Бюдэ, Р. Эц'ен, К. дэ Сэйсэль і інш.). Палітычная гістарыяграфія і мемуары (Б. дэ Манлюк, Брантом, Ж. дэ Таван і інш.). Погляды Ж. Бадэна. Гістарычная канцэпцыя Ж. Басюэ. Мемуары кардынала А.Рышэлье і Ф. Ларашфуко.

Ідэі Рэнесанса ў Англіі. Т. Мор, П. Віргілій, Р. Халіншэд, В. Кэмден. Гістарычныя погляды Ф. Бэкана. Грамадская думка ў эпоху Англійскай рэвалюцыі (Дж. Уінстэнлі, Дж. Лільберн, Дж. Мільтан, Э. Хайд, граф Кларэндон і інш.). Дж. Гарынгтан і Г. Барнет. Палітычныя і гістарычныя погляды Т. Гобса.

*Тэма 11. Гістарычныя веды ў Вялікім княстве Літоўскім*

Адлюстраванне ранняй гісторыі Вялікага Княства Літоўскага ў рускіх і еўрапейскіх крыніцах. "Летапісец вялікіх князёў Літоўскіх" і "Летапісец Вялікага княства Літоўскага і Жамойтскага". Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага паводле "Хронік Быхаўца". Баркулабаўскі летапіс.

Вялікапольская хроніка, хронікі Г. Латвійскага, Я. Длугаша, В. Вапоўскага, М. Стрыйкоўскага. Мемуарная літаратуры і дзённікі як крыніцы па гісторыі Вялікага княства Літоўскага (Дзённік" Ф. Еўлашэўскага, "Дыярыуш" А. Філіповіча, запіскі іншаземцаў і г.д.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 12. Еўрапейская гістарычная думка эпохі Асветы*

Філасофскія погляды асветнікаў. Разуменне накіраванасці, прагрэса і рухаючых сіл гісторыі. Плыні ў асветніцтве. Спецыфіка асветніцтва ў розных еўрапейскіх краінах.

Умовы фарміравання і рысы англійскага і шатландскага асветніцтва. Філасофскія і гістарычныя погляды Д. Юма. Э. Гібан. Гістарычныя погляды А. Сміта і значэнне яго прац для гісторыі і палітычнай эканоміі.

Сацыяльнна-палітычныя і ідэйныя асаблівасці германскага асветніцтва Гістарычная канцэпцыя І. Гердэра. І. В. Гётэ і Ф. Шылер як гісторыкі. Ю. Мёзер і зараджэнне рамантызма. Гёцінгенская школа і яе роля. І. Гатэрэр і А. Шлёцэр.

Гістарычная навука ў Францыі. Ш.Л. Мантэск'е. Ідэя лінейнага прагрэса. Гістарычная канцэпцыя Ж. Цюрго і фізіякратаў. Філосафы-матэрыялісты – Д. Дзідро, К. Гельвецый, П. Гольбах і іх разуменне гісторыі. Погляды Г. Рэйналя, Ж.- Ж. Русо і Г. Маблі.

Гістарычная думка Францыі падчас Вялікай французскай рэвалюцыі. З'яўленне паняцця "стары парадак".

*Тэма 13. Развіццё гістарычнай навукі ў Расіі ў XVIII ст.*

Сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і культурныя змены ў Расіі. Секулярызацыя культуры і ўплыў асветніцкіх ідэй. Рэформы Пятра I і развіццё гістарычнай самасвядомасці. Абгрунтаванне абсалютызма ў працах Ф. Пракаповіча. "Ядро Расійскай гісторыі" А. Манкіева і працы аб пятроўскай эпохе П. Шафірава і Б. Куракіна. В.Н. Тацішчаў і яго "Гісторыя Расійская".

Гістарыяграфія сярэдзіны XVIII ст. Заснаванне Расійскай Акадэміі навук. Г. Байер, Г. Мілер і А. Шлёцэр. Нарманская тэорыя і палеміка вакол яе. Гістарычная канцэпцыя М. В. Ламаносава.

Гістарычная навука ў II палове XVIIIст. Асветніцтва, ідэалогія "асвечанага абсалютызма". Спробы стварэння гістарычных твораў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кацярынай II. Распаўсюджванне гістарычных ведаў. А.І. Мусін-Пушкін. М.М. Шчарбатаў, яго палітычныя погляды і бачанне гісторыі Расіі. Гістарычныя погляды І. М. Болціна. М. І. Навікоў. Гістарычныя погляды А.М. Радзішчава.

*Тэма 14. "Гісторыя дзяржавы Расійскай" М.М. Карамзіна (1766-1826) як этап ў станаўленні расійскай гістарычнайнавукі*

М. М. Карамзін (1766-1826) і яго час. Тэарэтычная аснова стварэння "Гісторыі дзяржавы Расійскай" і крыніцазнаўчая база. Рухаючыя сілы гісторыі паводле Карамзіна, агульная канцэпцыя расійскай гісторыі. Перыядызацыя гісторыі Расіі і яе крытэрыі. Вузлавыя моманты гістарычнага працэса. Ацэнка Карамзіным гістарычных дзеячаў Расіі і прадстаўнікоў манархічнай улады. Расія і Еўропа ў трактоўцы Карамзіна. Гістарычная рэтраспектыва і сучасная Карамзіну рэальнасць. Значэнне працы М.М. Карамзіна для сучаснай яму гістарычнай навукі і для наступных этапаў у развіцці расійскай гістарыяграфіі.

*Тэма 15. Еўрапейская гістарыяграфія першай паловы XIX ст. Французская школа гісторыкаў перыяда Рэстаўрацыі і гістарычная школа права ў германскіх землях*

Крызіс асветніцтва і панаванне ідэі легітымізма і рэстаўрацыі. Тэарэтычныя асновы рамантычнай гістарыяграфіі і плыні ў рамантызме. Фарміраванне і змест кансерватыўнай ідэалогіі (Ж. дэ Местр, Л. дэ Банальд, Ф. Шатабрыян, Ф. Манлаз'е).

Ліберальная школа гісторыкаў перыяда Рэстаўрацыі і яе тэарэтычныя асновы. А. Ц'еры як заснавальнік ліберальнага накірунка. Ідэі Ц'еры аб класавым падзеле грамадства, сацыяльнай ролі гістарычнай навукі і г.д. Гістарычныя погляды і грамадская дзейнасць Ф. Гізо. Гістарычныя погляды Ж. дэ Сталь, Ф. Мінье і А. Ц'ера і іх працы па гісторыі Вялікай французскай рэвалюцыі. К.А. дэ Сен-Сімон і крытыка-утапічны сацыялізм. Буржуазная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гістарыяграфія 30-х-40-х. гг. XIX ст.: А. дэ Таквіль і А. Ламарцін. Дэмакратычная і камуністычная плыні (Ж. Мішле, Ф. Бюшэ, Л. Блан, Ф. Буанароці, Э. Кабе, Т. Дэзамі).

Умовы развіцця гістарычнай навукі ў германскіх землях. Нямецкая класічная філасофія і яе ўплыў на гістарычную думку. Гістарычныя погляды І. Фіхтэ, Ф. Шэлінга, Г. Гегеля. Нямецкі рамантызм.

Канцэптуальныя асновы гістарычнай школы права. Ф. Савіны. Гістарычная канцэпцыя Л. Ранке. Б. Нібур і крытыка крыніц.

*Тэма 16. Узнікненне і змест марксісцкай канцэпцыі гістарычнага развіцця*

Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя ўмовы ўзнікнення марксізма. Тэарэтычная аснова філасофскай і гістарычнай канцэпцыі К. Маркса і Ф. Энгельса. Матэрыялістычнае разуменне гісторыі і гістарычны дэтэрміннізм. Тэорыя сацыяльна-эканамічных фармацый. Роля народных мас і рэвалюцыі ў гісторыі. Прадукцыйныя сілы і вытворчыя адносіны. Базіс і надбудова.

Класавая барацьба і гістарычны працэс. “Маніфест Камуністычнай партыі”. Марксісцкая палітычная эканомія. “Капітал”. Роля марксізма ў еўрапейскай гістарычнай і філасофскай думцы.

*Тэма 17. Пазітывізм у еўрапейскай гістарыяграфіі. Англійская, французская і германская гістарычная навука.*

Фактары ўзнікнення пазітывісцкага накірунка ў філасофіі. Філасофскія і гістарычныя погляды Г. Спенсера. Развіццё гістарычнай навукі ў Англіі. Оксфардская і Кембрыджская школы. Гістарычныя працы У. Стэбса і Дж. Актана, Д. Грына. Г. Бокль і У. Лекі як буйнейшыя прадстаўнікі пазітывізма. Цывілізацыйная канцэпцыя А. Тойнбі.

Французскаягістарыяграфія 50-х60-х гг. XIX ст. “Стары парадак і рэвалюцыя” А. дэ Таквіля.Пазітывізм і філасофскія погляды А. Конта. І. Тэн.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ліберальны накірунак у пазітывісцкай гістарыяграфіі (А. Сарэль, А. Алар, А. Дэбідур, Ш. Сеньабос).Дэмакратычная і сацыялістычная гістарыяграфія. Ж. Мішле, Э. Кінэ, Л. Блан і г.д.

Аб'яднанне Германіі і актывізацыя гістарычных даследаванняў. Малагерманская гістарычная школа. І.Г. Дройзен і яго працы па антычнай гісторыі. Г. Зібель і яго гістарычныя погляды. Г. Трэйчке як "прарок рэйха". Т. Момзен і даследаванні антычнасці. Вялікагерманскі накірунак нямецкай гістарыяграфіі і яго канфесійная накіраванасць. Ю. Фікер і яго паляміка з Г. Трэйчке. І.Янсен і "Гісторыя нямецкага народа з канца сярэднявечча".Культурна-гістарычны сінтэз К. Лампрэхта. Сацыял-дэмакратычная гістарыяграфія (В. Лібкнехт, В. Блос, К. Каўцкі, Э. Бернштэйн).

*Тэма 18. Станаўленне гістарычнай навукі ў ЗША*

Пачатак амерыканскай гістарыяграфіі. Палітычныя і гістарычныя погляды Б. Франкліна. Т. Джэферсан і "Дэкларацыя незалежнасці". Т. Пейн і памфлет "Здаровы сэнс". Дж. Мэдісан і А. Гамільтан і іх канцэпцыі.

Гістарычная навука ЗША ў пачатку XIX ст. Рамантызм і заснаванне "ранняй школы". Гістарычная канцэпцыя Д. Бэнкрафта. Ідэйны змест даследаванняў Ф. Паркмена. Пашырэнне тэматыкі і змяненне акцэнтаў у гістарычных творах Дж. Мотлі і У. Прэскота. Барацьба ў амерыканскім грамадстве па праблеме рабства (Р. Хілдрэт і інш.).

*Тэма 19. Навуковая спадчына В.В. Ключэўскага (1841-1911) як дасягненне расійскай гістарычнай думкі*

Тэарэтычная аснова фарміравання філасофскіх і гістарычных поглядаў В.В. Ключэўскага. Змест і структура "Курса рускай гісторыі". Гістарычны дэтэрмінізм паводле Ключэўскага. Перыядызацыя гісторыі Расіі і яе крытэрыі. Дынаміка сацыяльна-эканамічнага развіцця. Эвалюцыя дзяржаўных інстытутаў і ўлады. Характарыстыкі гістарычных дзеячаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратурна-мастацкія вартасці твораў В.В. Ключэўскага. Значэнне прац В,В. Ключэўскага для развіцця расійскай гістарычнай навукі.

*Тэма 20.Гісторыя і беларусазнаўства ў другой палове XIX-пачатку XX ст.*

Умовы сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі ў парэформенны час. Актывізацыя даследаванняў па беларусазнаўству, беларускай філалогіі, краязнаўству і гісторыі Беларусі. "Заходнерусізм". Вывучэнне праблем гісторыі Беларусі ў расійскіх навуковых цэнтрах (А.А. Шахматаў, А. І. Сабалеўскі, М.А. Янчук). Стварэнне рэгіянальных этнаграфічных цэнтраў і іх дзейнасць. Навуковая спадчына Е.Р. Раманава, М.Я. Нікіфароўскага, А.М. Семянтоўскага, П.В. Шэйна і г.д.

Гісторыя зямель Вялікага княства Літоўскага ў працах М.К. Любаўскага. Беларуская тэматыка ў працах украінскіх гісторыкаў - В. Я. Данілевіча і П.В. Галубоўскага. Польскія гісторыкі Т. Корзан, У. Смаленьскі аб заходнім і ўсходнім уплыве ў Рэчы Паспалітай, яе падзелах, сацыяльна-эканамічным становішчы і г.д.

*Тэма 21. Еўрапейская гістарыяграфія ў першай палове XX ст.: разнастайнасць канцэпцый і пашырэнне праблемнага поля даследавання*

Сацыяльна-палітычныя ўмовы развіцця гістарычнай навукі ў пачатку XX ст. Метадалагічная разнастайнасць. Пошукі новых шляхоў філасофскага тлумачэння быцця. "Закат Еўропы" (О. Шпенглер), "філасофія жыцця" (Ф. Ніцшэ), неаканціянства (В. Віндэльбанд, Г. Рыкерт) і неагегельянства (Б. Крочэ). Інтэнсіўнае развіццё сумежных з гісторыяй дысцыплін (сацыялагічныя канцэпцыі М. Вебера, П. Сарокіна і інш.).

Умовы развіцця гістарычнай навукі Германіі. Пангерманізм і пангерманская гістарыяграфія (Г. фон Белоў, Д. Шэфер). Метадалагічныя прынцыпы неаранкеанства, яго кансерватыўны (М. Ленц, Э. Маркс, ф. Рахфаль) і ліберальны (Г. Дальбрук, Г. Онкен, Э. Трольч) накірунак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гістарычная навука ва ўмовах нацызма. Ідэалагічныя асновы і тэматыка гістарычных даследаванняў Германіі ў часы Трэцяга Рэйха (К. Мюлер, В. Франк). Германская гістарычная навука ў эміграцыі.

Ідэйная сітуацыя ў французскай гістарыгяраф. Крызіс пазітывізма, рэвалюцыя ў карціне свету, метадалагічныя пошукі. Э. Дзюркгейм, А. Бер і станаўленне сацыялагічнай школы. "Гістарычны сінтэз" і крытыка пазітывізма. Навуковая спадчына і ідэалагічная разнастайнасць буйнейшых французскіх гісторыкаў: Ф. Сіміяна, М. Моса, М. Хальбвакса, А. Вандаля, А. Мацьеза, А. Алара, Э. Лавіса, Ж.  Жарэса і г.д.Узнікненне школы "Аналаў", яе метадалагічныя прыярытэты і поле даследавання.

Ліберальны і кансерватыўны накірунак у брытанскай гістарыяграфіі (Дж. Трэвельян), радыкальная гістарыяграфія (Дж. Гобсан). Гісторыкі марксісцкага накірунку (Дж. Коналі, Ф. Ратштэйн). А. Тойнбі і яго "Спасціжэнне гісторыі". Метадалагічныя асновы канцэпцыі Р. Дж. Калінгвуда.

*Тэма 22. Станаўленне і развіццё савецкай гістарыяграфіі і яе ідэалагічныя прыярытэты*

Кастрычніцкая рэвалюцыя і сістэмная трансфармацыя ў Расіі. Перэарыентацыя гістарычнай навукі. Рэарганізацыя навуковых устаноў. Усталяванне марксісцкай метадалогіі ленінска-сталінскага ўзору. Вытясненне і рэпрэсіі старых кадраў. "Філасофскі параход" 1922 г. і высылка шэрагу буйнейшых расійскіх гісторыкаў.

М.М. Пакроўскі як стваральнік марксісцкай гісторыі Расіі. Тэорыя гандлевага капітала. Лёс М.М. Пакроўскага і месца яго твораў у гістарыяграфіі. Усталяванне партыйнага і ідэалагічнага дыктата І.В. Сталіна. Артыкул Сталіна ў часопісу "Пралетарская рэвалюцыя". "Кароткая гісторыя ВКП (б)" як нарматыўны метадалагічны твор для гісторыкаў СССР. Ідэалагічныя і тэматычныя абмежаванні, ідэйная ізаляцыя савецкай гістарычнай навукі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 23. Гістарычная навука Беларусі (1917-1941)М.В. Доўнар-Запольскі (1867-1934) і У.М. Ігнатоўскі (1881-1931)*

Становішча Беларусі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі і праблемы нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Усталяванне савецкай улады і палітыка беларусізацыі. Стварэнне Інбелкульта і Беларускай акадэміі навук. Навуковая спадчына В.Ю. Ластоўскага, М.В. Доўнар-Запольскага, У.І. Пічэты, У.М. Ігнатоўскага. Археалагічныя даследаванні К.М. Палікарповіча і Ю. Попеля. Згортванне беларусізацыі. Усталяванне таталітарнага кіравання гістарычнй навукай. Палітычныя працэсы 30-х гг. і рэпрэсіі ў беларускай навуцы.

Гістарычныя працы М.В. Доўнар-Запольскага. Канцэпцыя этнагенэза і этнічная тэрыторыя. Праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця. Вялікае княства Літоўскае і Рэч Паспалітая ў гістарычным развіцці Беларусі. В. Ластоўскі і “Кароткая гісторыя Беларусі”. У.М. Ігнатоўскі і яго “Кароткі нарыс гісторыі Беларусі”. Перыядызацыя гісторыі Беларусі, канцэпцыя этнагенэза. Вялікае княства Літоўскае і Рэч Паспалітая. Прычыны і фактары падзелаў Рэчы Паспалітай. Беларускія землі ў складзе Расійскай імперыі.

*Тэма 24. Метадалагічныя асновы і праблемнае поле савецкай гістарычнай навукі (1945-1991)*

Пасляваенныя ідэалагічныя арэнціры і тэматычныя перавагі. Ізаляцыя савецкай гістарычнай навукі і ідэалагізацыя даследаванняў. Сацыяльны заказ і палітычная прапаганда ў гістарычнай навуцы.

Частковая лібералізацыя навуковага жыцця пасля смерці І.В. Сталіна. Тэматычнае кола даследаванняў. Фундаментальныя серыйныя выданні па гісторыі. Ідэалагізацыя і дагматызм гістарычнай навукі перыяду “застою”, тэматыка асноўнай масы навуковых прац. Маскоўская і ленінградская школа гісторыкаў. Навуковыя працы Б.Д. Грэкава, М.М. Ціхамірава, М.М. Дружыніна, А.А. Зіміна, Л. У. Чарапніна, І.А. Фядосава, М.В. Нечкінай, Б.А. Рыбакова, В.Т. Пашута, С.Д. Сказкіна, А.С. Ерусалімскага і інш. Праблемы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Новай гісторыі ў працах М.А. Барга, В.П. Волгіна, Б.Ф. Поршнева, А.З. Манфрэда, А.В. Адо, А.Д. Люблінскай, А.А. Фурсенка і інш. Гістарычныя і грамадскія погляды М.М. Бахціна і Д.С. Ліхачова.

Гістарычнная навука БССР: тэматыка даследаванняў, ідэалагічныя арыецiры, асноўныя навуковыя пастулаты. Л.С. Абецэдарскі. Навуковыя працы Э.М Загарульскага, Г.В. Штыхава, В.В. Сядова, М.Я. Грынблата, А.І. Мальдзіса, А.П. Грыцкевіча, П.А. Лойкі, Я.А. Юхо, З.В. Шыбекі, М.В. Біча, М.С. Сташкевіча і інш.

Палітыка перабудовы ў СССР і ідэалагічны перацом. Метадалагічны плюралізм і пашырэнне кола даследаванняў. Узрастанне інтарэса грамадскасці да гісторыі і ліквідацыя "белых плямаў" у гістарыяграфіі, Гістарычная публіцыстыка, тэматычныя перавагі перыяду. Распад СССР і крушэнне марксісцкай метадалогіі як адзінай кіруючай. Нігілізм ц гістарычнай навуцы. Сістэмны крызіс пасля распаду СССР і ўплыў яго на стан гістарычнай навукі.

*Тэма 25. Гістарычная думка Заходняй Еўропы і ЗША пасля Другой сусветнай вайны: метадалагічныя падыходы і накірункі даследаванняў*

Умовы развіцця гістарычнай навукі. Экзістэнцыялізм, структуралізм, постструктуралізм. Постіндустрыяльнае грамадства. Постмадэрнізм.

Гістарычная навука ЗША: заняпад прагрэсісцкага накірунку, тэорыя "ўзгодненых інтарэсаў. Гістарычныя працы Л. Харца, Д. Бурсціна, Р. Браўна, Р. Хафстэдэра, А.М. Шлезінгера-малодшага. "Новая гістарычная навука" і "пострэвізіяністскі сінтэз".

Умовы развіцця брытанскай гістарычнай навукі. "Новая гісторыя". Ідэйная разнастайнасць гістарычных даследаванняў. Працы Э. Томпсана, Э. Хобсбоўма, А.Л. Мортана, Т. Баркера, П. Берка і інш.

Гістарычная навука Францыі. Структуралізм (К. Леві-Строс, М. Фуко). Тэорыя "індустрыяльнага грамадства" (Р. Арон). Малодшыя пакаленні школы "Аналаў": П. Шаню, Э. Ле Руа Ладзюры, Ж. Ле Гоф, Ж. Дзюбі, Ф.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фюрэ, М. Феро. “Колькасная гісторыя” і сацыяльна-эканамічныя даследавані (Э. Лабрус, Ж. Бувье). Даследаванні П. Рэнувена, Ж.-Б. Дзюразэля, Р. Мунье, Ж. Лефеўра, А. Сабуля, Ж. Гадшо і інш.

Плыні ў германскай гістарыяграфіі. Неамарксізм (Т. Адорна, Ю. Хабермас). Марбургская школа. Кансерватыўная плынь (Г. Рыттэр, Г.І. Шопс). Канцэпцыя Ф. Фішэра і яго паслядоўнікаў, паварот да сацыяльнай гісторыі (В. Копцэ, Г. Ротфельс, Р. Казелек, М. Штюрмер і г.д.). Сацыяльна-крытычная школа (Ю. Кокі, Г. Вінклер, В. Момзен і інш.). Неагістарызм (Т. Ніпердай, Л. Галь). Праблема нацызма.

*Тэма 26. Гістарычная канцэпцыя школы “Аналаў”. “Матэрыяльная цывілізацыя, эканоміка і капіталізм XV-XVIII ст.” Ф. Брадэля (1902-1885)*

Гістарычныя перадумовы ўзнікнення школы “Аналаў” і яе канцэптуальны змест.

“Матэрыяльная цывілізацыя, эканоміка і капіталізм XV-XVIII ст.” Ф. Брадэля (1902-1885) як прыклад навуковай працы школы “Аналаў”. Змест паняцця “матэрыяльная цывілізацыя”, “матэрыяльная гісторыя”, “глабальная гісторыя” і г.д. Метадалогія працы, храналагічныя і і геаграфічныя рамкі. Праблематыка “Матэрыяльнай цывілізацыі…” і аб’екты разгляду. Структуры паўсёдзеннасці. Часовыя прамежкі і гістарычныя цыклы. Канцэпцыя розных хуткасцей гістарычнага часу.

**Раздзел III. Перспектывы і накірункі гістарычнай навукі на сучасным этапе (канец XX – пачатак XXI ст.)**

*Тэма 27. Сучасныя накірункі развіцця і пашырэнне сферы гістарычнага даследавання. Міждысцыплінарны падыход*

Тэндэнцый і супярэчнасці сучаснага развіцця сусветнай цывілізацыі і іх уплыў на гістарычныя даследаванн. Усход і Захад. Міжцывілізацыйны дыялог. Працэс глабалізацыі, яго станоўчыя і адмоўныя бакі.Навукова-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэхнічныя дасягненні і іх прымяненне ў гістарычных даследаваннях. Міждысцыплінарны падыход.

Метадалагічная разнастайнасць сучаснай гістарычнай навукі. Сітуацыя постмадэрна ў гістарычным пазнанні і яе характэрыстыкі. Змена навуковай парадыгмы. Антрапалагічны і лінгвістычны павароты. Гістарычная сінэргетыка. Новыя падыходы ў гістарычных даследаваннях. Гісторыя паўсёдзеннасці, дэмаграфічная гісторыя, гендэрная гісторыя, вусная гісторыя, інтэлектуальная гісторыя, мікра-і макрагісторыя, гістарычная фенаменалогія і інш.

Метадалагічныя трансфармацыі і змяненне тэматыкі даследаванняў у расійскай і постсавецкай гістарыяграфіі. Разнастайнасць падыходаў і пашырэнне прадметнага поля даследавання.

*Тэма 28. Новыя тэндэнцыі і праблемы гістарычнай навукі ў Беларусі на сучасным этапе*

Распад СССР і крушэнне метадалагічных асноў савецкай гістарычнай навукі. Станаўленне незалежнасці Рэспублікі Беларусь і новыя прыярытэты айчыннай гістарычнай навукі. Актывізацыя ў грамадстве інтарэса да гісторыі. Вяртанне ў гістарычную навуку прац і персаналій. Гісторыя і мастацкая літаратура. Дыскусійныя пытанні гісторыі Беларусі і спрэчкі ў навуковым асяроддзі. Фарміраванне новых гістарычных канцэпцый ва ўмовах нацыянальна-культурнага адраджэння. Гістарычная навука ў навуковых установах Рэспублікі Беларусь. Беларуская нацыянальная ідэя.

Захаванне пераемнасці гістарычнай навукі савецкага і постсавецкага часу. Новыя канцэптуальныя падыходы да этнагенэза беларусаў, сутнасці і развіцця Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай і яе падзелаў і інш. Канцэпцыя этнагенэза беларусаў М.Ф. Піліпенкі, працы М.І. Ермаловіча, М.І. Сагановіча і інш. Распрацоўка праблематыкі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны. Абагульняючыя і шматтомныя працы па айчыннай гісторыі. Праблемы ўсеагульнай гісторыі ў гістарычнай навуцы Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Кольк. гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінар. заняткі | | |
| **Уводзіны** | | | | |
| 1. Прадмет, задачы і асноўныя паняцці курса | 1 | | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, стварэнне праблемнай сітуацыі. |
| **Раздзел І. Тэарэтычныя асновы і метадалогія гістарычнай навукі** | | | | |
| 2. Гісторыя і гістарычны факт | 1 | | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, стварэнне праблемнай сітуацыі. |
| 3. Сацыяльныя функцыі гістарычнай навукі | | | 1 | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, стварэнне праблемнай сітуацыі, стварэнне прэзентацыі, падрыхтоўка рэферата. |
| 4. Прынцыпы і метады гістарычнага даследавання | 1 | | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае. |
| 5. Фарміраванне метадалогіі гістарычнай навукі і яе развіццё ў XIX-XXI ст. | 2 | | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае. |
| 6. Гісторыя як цэлае. Праблема дынамікі гістарычнага развіцця. | 1 | | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, стварэнне |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Гістарычны дэтэрмінізм. | | | | праблемнай сітуацыі. |
| **Раздзел II. Гісторыя станаўлення і развіцця гістарычнай навукі (ад старажытнасці да канца XX ст.)** | | | | |
| 7. Узнікненне гістарычных ведаў. Антычная гістарыяграфія | 1 | | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова. |
| 8. Развіццё гістарычных уяўленняў у Сярэднявеччы | 1 | | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова. |
| 9. Узнікненне і развіццё гістарычных ведаў на землях Русі. | | | 2 | Апытанне, падрыхтоўка і абарона рэферата, прэзентацыі, індывідуальныя заданні. |
| 10. Гістарычныя веды ў Еўропе ў Ранні Новы час (XVI-XVII ст.) | 1 | | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова. |
| 11. Гістарычныя веды ў Вялікім княстве Літоўскім | | | 2 | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова. |
| 12. Еўрапейская гістарычная думка эпохі Асветы | 1 | | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова. |
| 13. Развіццё гістарычнай навукі ў Расіі ў XVIII ст. | | | 1 | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова. |
| 14. "Гісторыя дзяржавы Расійскай" М.М. | | 2 | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Карамзіна (1766-1826) як этап у станаўленні расійскай гістарычнай навукі | | | | эўрыстычная размова, падрыхтоўка прэзентацый. |
| 15.Еўрапейская гістарыяграфія першай паловы XIX ст. Французская школа гісторыкаў перыяда Рэстаўрацыі і гістарычная школа права ў германскіх землях | 1 | | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова. |
| 16. Узнікненне і змест марксісцкай канцэпцыі гістарычнага развіцця | 1 | | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова. |
| 17. Пазітывізм у еўрапейскай гістарыяграфіі. Англійская і французская і германская гістарычная навука. | 2 | | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова. |
| 18. Станаўленне і развіццё гістарычнай навукі ў ЗША | | | 1 | Апытанне, падрыхтоўка і абарона рэферата, прэзентацыі, індывідуальныя заданні. |
| 19. Навуковая спадчына В.В. Ключэўскага (1841-1911) як дасягненне расійскай гістарычнай думкі | | 2 | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова, падрыхтоўка прэзентацый. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 20. Гісторыя і беларусазнаўства ў другой палове XIX-пачатку XX ст. | | | 1 | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова, падрыхтоўка прэзентацый. |
| 21. Еўрапейская гістарыяграфія ў першай палове XX ст: разнастайнасць канцэпцый і пашырэнне праблемнага поля даследаванняў | 2 | | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова. |
| 22. Станаўленне і развіццё савецкай гістарыяграфіі і яе ідэалагічныя прыярытэты | 2 | | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова. |
| 23. Гістарычная навука Беларусі (1917-1941). М.В. Доўнар-Запольскі (1867-1931) і У.М. Ігнатоўскі (1881-1931) | | 2 | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова, стварэнне праблемнай вучэбнай сітуацыі, падрыхтоўка прэзентацый. |
| 24. Метадалагічныя асновы і праблемнае поле савецкай гістарычнай навукі (1945-1991) | | | 2 | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова, стварэнне праблемнай вучэбнай сітуацыі, падрыхтоўка прэзентацый. |
| 25. Гістарычная думка Заходняй Еўропы і ЗША пасля Другой сусветнай | 1 | | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| вайны: метадалагічныя падыходы і накірункі даследаванняў. | | | | |
| 26. Гістарычная канцэпцыя школы “Аналаў”. “Матэрыяльная цывілізацыя, эканоміка і капіталізм XV-XVIII ст.” Ф. Брадэля (1902-1985) | | 2 | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова, стварэнне праблемнай вучэбнай сітуацыі, падрыхтоўка прэзентацый. |
| **Раздзел III. Перспектывы і накірункі гістарычнай навукі на сучасным этапе (канец XX – пачатак XXI ст.)** | | | | |
| 27. Сучасныя накірункі развіцця і пашырэнне сферы гістарычнага даследавання. Міждысцыплінарны падыход | 1 | | 2 | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова. |
| 28. Новыя тэндэнцыі і праблемы гістарычнай навукі ў Беларусі на сучасным этапе. | | 2 | | Апытанне індывідуальнае і франтальнае, эўрыстычная размова, стварэнне праблемнай вучэбнай сітуацыі, падрыхтоўка прэзентацый. |
| Усяго | 20 | 10 | 12 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*


1. *Историография* античной истории: учеб.пособие по спец. «История» / В.И. Кузищин, А.И. Немировский, Э. Д. Фролов; Под ред. В.И. Кузищина. – М.: Высш. шк., 1980. – 415 с.
2. *Историография БССР.* Эпоха феодализма / Учеб.пособие для студ. ист. фак / Науч. ред. Я.Н. Мараш. – Мн.: Университетское, 1986. – 253 с.
3. *Историография* истории нового времени стран Европы и Америки: Учеб.пособие для вузов по спец. «История» / А.В. Адо и др. ; Под общ. ред. И.П. Дементьева. – М.: Высш. шк. – 1990. – 511 с.
4. *Историография* истории России до 1917 г.: Учеб.пособие для студ. высш. учеб. заведений: В 2 т. / Под ред. М.Ю. Лачаевой. – М.: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 2004.
5. *Ковальченко, И.Д.* Методы исторического исследования /И.Д. Ковальченко. – М.: Наука, 1987. – 438 с.
6. *Лепешко, Б.М.* Методология и логика истории / Б.М. Лепешко. – Брест: Альтернатива, 2007. – 192 с.
7. *Лінднэр, Р.* Гісторыкі і ўлада: Нацыятворчы працэс и гістарычная навука ў Беларуси XIX – XX ст. / Райнэр Лінднэр [Пер. з ням. Л. Баршчэўскага] – Мн.: 2005. – 538с.
8. *Методологические* проблемы истории: учеб.пособие для студентов, магистрантов и аспирантов ист. и филос. специальностей, обеспечивающих получение высш. образования / В.Н. Сидорцов [и др.]; под общ. ред. В.Н. Сидорцова. – Мн.: ТетраСистемс, 2006. – 352 с.
9. *Методология истории:* Учеб.пособие для студентов вузов / А.Н. Нечухрин, В.Н. Сидорцов, О.М. Шутова и др. – Мн.: НТООО «ТетраСистемс», 1996. – 240 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. *Михнюк, В.Н.* Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919-1941): Автореф. на соискание уч. степ.д-ра ист. наук. – Мн.: Ин-т истории, 1987.
11. *Постмодернизм:* Энциклопедия / Сост. А.А. Грицанов, М.А. Можейко. – Мн.: Интерперссервис; Книжный дом. – 2001. – 1040 с.
12. *Сидорцов, В.Н.* Методология исторического исследования: Механизм творчества историка / В.Н. Сидорцов – Мн.: БГУ, 2000. – 231 с.
13. *Смоленский, Н.И.* Теория и методология истории: учеб.пособие для студ. высш. учеб. заведений / Н.И. Смоленский. – М.: Издательский центр «Академия», 2007. – 272 с.
14. *Шапиро, А.Л.* Русская историография с древнейших времен до 1917 г.: учеб.пособие. – М.: Ассоц. «Россия»: Культура. – 1993. – 761 с.

*Дадатковая*

1. *Блок,М.* Апология истории или ремесло историка / Марк Блок. – М.: Наука, 1986. – 256 с.
2. *Бродель, Ф.* Материальная цивилизация, экономика и капитализм XV-XVIIIвв. В 3 кн. / Фернан Бродель; Ред. И.В. Рудницкая. – М.: ООО «Самарский дом печати», 2006-2007.
3. *Вайнштейн, О.Л.* Западноевропейская средневековая историография /О.Л. Вайнштейн. – М.-Л.: Наука, 1964. – 483 с.
4. *Вебер, М.* Избранное. Образ общества / Макс Вебер. – М.: Юрист, 1994. – 704 с.
5. *Геродот (485-425 гг. до н.э.).* История / Геродот [пер. с древнегреч. и примечания Г.А. Стратановского] – М.; АСТ Москва; Тверь; АСТ, 2004. – 699 с.
6. *Гизо, Ф.* История цивилизации в Европе / Франсуа Гизо. – Мн.: БелЭн, 2005. – 416 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. *Данилевский, Н.*Я. Россия и Европа / Николай Данилевский. – М.: ЭКСМО, 2003. – 640 с.
8. *Довнар-Запольский, М.В.* История Белоруссии / М.В. Довнар-Запольский. – 2-е изд., Мн.: Беларусь, 2005. – 678 с.
9. *Иггерс, Г., Ван, Э.* Глобальная история современной историографии / Г. Иггерс, Э. Ван (при участии Суприи Мукерджи); пер. с англ. О. Воробьевой, науч. рад. М. Кукарцева. – М. : «Канон+», РОИИ «Реабилитация», 2012. – 432 с.
10. *Ігнатоўскі, У.М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі /У.М. Ігнатоўскі; Уступ. Арт. А.П. Грыцкевіча; Камент. І заўвагі Э.П. Гнеўкі. – 5-е выд.– 5-е выд. – Мн.: Беларусь, 1991. – 190 с.
11. *Историческая* наука сегодня: Теория, методы, перспективы / Под ред. Л.П. Репиной. – М. : Изд-во ЛКИ, 2011. – 608 с.
12. *Карев, Д.В.* Белорусская историография в конце XVIII – начале XX в.: Автореф. дис. на соискание науч. степени д-ра ист. наук 07 00 09 / АН Беларуси, Ин-т истории, 1995.
13. *Карамзин, Н.*М. История государства Российского. В 12 томах / Николай Михайлович Карамзин; Под ред. А.Н. Сахарова. – М.: Наука, 1989-1996.
14. *Ключевский, В.*О. Русская история. В пяти томах /Василий Осипович Ключевский. – Вступительная статья А.Ф. Смирнова; Составление, примечание, указатель А.М. Кузнецова. – М.: «РИПОЛ КЛАССИК», 2001. – 880 с.
15. *Летописец* Великого княжества Литовского и Жомойтского: Паводле спіску гр. Рачынскага, перадрук з 17 т. “Полного собрания русских летописей”. – Выд. В. Ластоўскага коштам беларускага цэнтра ў Літве. – Коўна: Друк. Ф. Сакалоўскай і Г. Лаппо, 1925. – 56 с.
16. *Макиавелли, Николо (1469-1529).* Государь Рассуждения о первой декаде Тита Ливия: перевод с итальянского / Николо Макиавелли / М.: АСТ Москва: Транзиткнига; Кызыл: АСТ, 2006. – 461 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

17. *Меньковский, В.И.* Англо-американская советология: история, современность, академические ресурсы / В.И. Меньковский [Науч. ред. В.С. Кошелев] - Мн.: ИП Экоперспектива, 2000. – 158 с.
18. *Могильницкий, Б.Г.* Введение в методологию истории / Б.Г. Могильницкий. – М.: Высш. школа, 1989. – 174 с.
19. *Плутарх.* Избранные жизнеописания. В двух томах / Плутарх / Пер. с древнегр. Сост., вступ. ст., прим. М. Томашевской. – М.: Правда, 1986.
20. *Репина, Л.П.* «Новая историческая наука» и социальная история / Л.П. Репина. – Изд. 2-е, испр. и доп. – М. : Изд-во ЛКИ, 2009. – 320 с.
21. *Рубинштейн, Н.Л.* Русская историография / Под ред. А.Ю. Дворниченко, Ю.В. Кривошеева, М.В. Мандрик. –СПб. : Изд-во СПб ун-та, 2008. – 938 с.
22. *Светоний, Г.Т.* Жизнь двенадцати цезарей / Гай Светоний Транквилл. – Пер. с лат. М.Л. Гаспарова; Послесл. М.Л. Гаспарова, Е.М. Штаерман. – М.: Правда, 1988. – 512 с.
23. *Сидорович, О.В.* Анналисты и антиквары: римская историография конца III – I вв. до н.э. / О.В. Сидорович. – М.: РГГУ, 2005. – 287 с.
24. *Сидорцов, В.Н.* Методология исторического исследования: Механизм творчества историка / В.Н. Сидорцов – Мн.: БГУ, 2000. – 231 с.
25. *Советская* историография: Сборник. – М.: РГГУ, 1996. – 601с.
26. *Современная* российская историография / В.И. Меньковский [и др.]; под ред. В.И. Меньковского. В 2 ч. – Минск: РИВШ, 2009.
27. *Тойнби, А.* Постижение истории / Арнольд Тойнби. – СПб: Ювента, 1996. – 480 с.
28. *Февр, Л.* Бои за историю /Люсьен Февр. – М.: Наука, 1991. – 629 с.
29. *Хроника* Быховца: [Предисл., коммент. И пер. Н.Н. Улащика. Отв. ред. М.Н. Тихомиров]. – М.: Наука, 1966. – 154 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Характарыстыка рэкамендаваных метадаў выкладання

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў дапошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

- гісторыка-тэматычны падыход;
- тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
- тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
- камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, дыялогі, эўрыстычная гутарка і г.д.);
- стварэнне, аналіз і вырашэнне вучюбна-праблемных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыяй кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыцы правядзення семінарскіх заняткаў выкарыстоўваюцца падрыхтоўка студэнтамі электронных прэзентацый, апытанне індывідуальнае і групавое, дыялог, дыскусія і г.д.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

шэння эфектыўнасці засваення вучэбнага матэрыялу па выкладаемай дысцыпліне і фарміравання прафесійных кампетэнцый вучэбным планам спецыяльная работа студэнтаў, якая накіравана на актывізацыю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, фарміравання ўменняў і навыкаў самастойнага набыцця і абагульнення ведаў, іх самастойнага прымянення на практыцы, а таксама самаразвіццё і самаўдасканаленне.

Арганізацыя самастойнай работы прадугледжвае працу з навуковай і вучэбнай літаратурай, вывучэнне студэнтамі асобных пытаняў ці тэм дысцыпліны,  падрыхтоўку да семінарскіх заняткаў, экзамена ці заліка. Для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кантроля эфектыўнасці самастойнай работы студэнтаў прадугледжаны наступныя яго сродкі і формы: выступленні студэнтаў на семінарскіх занятках па дысцыпліне, падрыхтоўка і абарона рэфератаў па пытаннях, вызначаных для самастойнага вывучэння, тэставыя заданні і пісьмовыя адказы, падрыхтоўка мультымедыя-прэзентацый па вывучаемых раздзелах і пытаннях, індывідуальнае і групавое апытанне, стварэнне праблемных сітуацый і г.д.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ